# У дзяржрэгуляванні лічбавага развіцця Беларусі адбыліся змены

У мэтах удасканалення дзяржаўнага рэгулявання лічбавага развіцця ўнесены змяненні ва ўказ ад 7 красавіка 2022 года нумар 136 «Аб органе дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавага развіцця і пытаннях інфарматызацыі». Адпаведны ўказ нумар 200 падпісаў 19 мая Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА у прэс-службе беларускага лідэра.

Дакумент накіраваны на далейшую актывізацыю рэгіянальнага лічбавага развіцця за кошт сродкаў мясцовых інавацыйных фондаў, пашырэнне пераліку паслуг галіновых офісаў цыфравізацыі і РУП «Цэнтр лічбавага развіцця», што аказваюцца дзяржаўным органам і арганізацыям за кошт бюджэтных сродкаў, у тым ліку па планаванні іх лічбавага развіцця, суправаджэнні інфармацыйных сістэм, маштабаванні пілотных праектаў.

З улікам значнасці пытанняў лічбавага развіцця для эканомікі ўказам таксама замацоўваецца, што прэм'ер-міністр Беларусі курыруе Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і ўзначальвае Назіральную раду Парка высокіх тэхналогій.

**Source URL:**
*https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/u-dzyarzhregulyavanni-lichbavaga-razviccya-belarusi-adbylisya-zmeny*